ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 9 (683) | Аўторак, 15 сакавіка 1988 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*На сустрэчы ў Цэнтральным Камітэце КПБ*

## Па актуальных пытаннях

9-га сакавіка ў ЦК Кампартыі Беларусі адбылася сустрэча з прафсаюзнымі актывістамі рэспублікі. Тут вялася размова аб тым, як навучыцца працаваць ва ўмовах далейшага паглыблення дэмакратыі, радыкальнай эканамічнай рэформы, нарастаючай актыўнасці мас.

На сустрэчы выступіў першы сакратар ЦК КПБ Я. Я. Сакалоў.

У абмеркаванні сучасных праблем перабудовы прынялі ўдзел прафсаюзныя работнікі, якія прадстаўлялі розныя галіны народнай гаспадаркі. Яны самакрытычна выяўлялі прычыны недахопаў, называлі канкрэтныя шляхі актывізацыі работы.

Адзначалася, што адна з важнейшых праблем, якая чакае свайго вырашэння, — гэта прадуманая арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва пры пераходзе працоўных калектываў на гаспадарчы разлік і самафінансаванне. Падкрэслівалася таксама, што сёння яшчэ не ў поўнай меры выкарыстоўваюцца яго магчымасці для мабілізацыі працоўных на паспяховую рэалізацыю планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця.

На сустрэчы з прафсаюзнымі актывістамі ў ЦК КПБ выступіла старшыня прафкома студэнтаў нашага універсітэта Н. І. Колтышава. Яна гаварыла аб укараненні студэнцкага самакіравання, яго ўздзеянні на вучэбна-выхаваўчы працэс, аб неабходнасці далейшага паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы вышэйшых навучальных устаноў і сацыяльна-бытавых умоў, асабліва для тых студэнтаў, якія маюць сем'і. Н. І. Колтышава закранула і некаторыя іншыя праблемы, якія звязаны з перабудовай вышэйшай школы.

Удзельнікі сустрэчы адзначалі, што саветам і камітэтам прафсаюзаў трэба смялей выкарыстоўваць свае правы і магчымасці ў вырашэнні сацыяльных пытанняў, задавальненні патрэб і законных інтарэсаў працоўных. Марудна разгортваецца будаўніцтва жылля гаспадарчым спосабам, часта парушаецца прынцып сацыяльнай справядлівасці пры размеркаванні жылой плошчы. Патрабуе сур'ёзнага паляпшэння арганізацыя грамадскага харчавання, бытавога, гандлёвага і медыцынскага абслугоўвання насельніцтва.

У ходзе сустрэчы былі закрануты праблемы школьнай рэформы, вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, павышэння якасці навучання і перападрыхтоўкі спецыялістаў, а таксама пытанні масавасці фізічнай культуры і спорту, аздараўлення і загартоўкі дзяцей і падлеткаў. Указвалася на тое, што ў значным паляпшэнні мае патрэбу дзейнасць прафсаюзных арганізацый па ідэалагічнаму, інтэрнацыянальнаму, працоўнаму і маральнаму выхаванню савецкага чалавека.

Гаварылася і аб тым, што яшчэ нямала трэба зрабіць, каб пераадолець фармалізм у рабоце прафсаюзаў, узмацніць крытыку і самакрытыку, патрабаванне да кадраў за даручаную справу. Гэта дапаможа рэалізаваць велізарны патэнцыял прафсаюзаў у ажыццяўленні курсу партыі на сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны.

У сустрэчы прынялі ўдзел таварышы В. І. Борыс, М. І. Дземянцей, М. С. Ігруноў, Ю. Б. Колакалаў, У. А. Ляпёшкін, В. А. Пячэннікаў.

*Канферэнцыя*

## Пра літаратуру і перабудову

Абмеркаванню праблем сучаснай савецкай прозы была прысвечана канферэнцыя «Літаратура і перабудова», якая адбылася ў інстытуце ўдасканалення настаўнікаў. У ёй прынялі ўдзел выкладчыкі школ горада, вобласці і кафедры рускай літаратуры нашага універсітэта.

Усеагульная зацікаўленасць, жывы абмен думкамі, глыбокі аналіз і эмацыянальныя адносіны да прачытанага — такая атмасфера, што панавала на канферэнцыі. Гутарка ішла аб творах, якія аказаліся ў цэнтры ўвагі сучаснага чытача: раманах А. Рыбакова «Дзеці Арбата», Д. Граніна «Зубр», А. Дудзінцава «Белыя адзенні», Ч. Айтматава «Плаха», аповесцях В. Распуціна «Пажар», В. Астаф'ева «Сумны дэтэктыў», А. Прыстаўкіна «Начавала хмарка залатая».

Уступнае слова дацэнта кафедры рускай літаратуры М. В. Родчанкі аб ролі літаратуры ў развіцці грамадства, сувязі савецкай літаратуры з актуальнымі пытаннямі рэчаіснасці паслужыла пачаткам дыскусіі. Вялікую цікавасць у прысутных выклікалі пытанні, якія маюць непасрэдныя адносіны да сённяшняга дня: складаная гістарычная абстаноўка 30-х гадоў, мастацкая канцэпцыя вобразу Сталіна, барацьба за духоўнасць чалавека, фарміраванне асобы дзіцяці ў экстрэмальнай сітуацыі. Перад удзельнікамі канферэнцыі сталі праблемы, адказы на якія пакуль не дае ні крытыка, ні літаратуразнаўства.

Ажыўленую дыскусію выклікала абмеркаванне рамана Ч. Айтматава «Плаха».

Не толькі чытальніцкую, але і прафесіянальную цікавасць выклікала ў педагогаў аповесць А. Прыстаўкіна «Начавала хмарка залатая», у якой раскрываецца лёс дзяцей, што перанеслі цяжкасці вайны, голаду, эвакуацыі, безбацькоўшчыны. У характары дзіцяці, якое трапіла ў экстрэмальную сітуацыю, факусіруюцца ўсе балявыя кропкі часу.

Вынікі дыскусіі падвёў загадчык кафедры рускай літаратуры ГДУ дацэнт У. М. Сабаленка. Ён падзяліўся ўспамінамі аб сустрэчах з віднымі дзеячамі літаратуры і мастацтва (Айтматавым, Ромам), навукова абгрунтаваў заканамернасці развіцця сучаснай савецкай прозы.

Хочацца пажадаць, каб падобныя сустрэчы сталі добрай традыцыяй.

**Н. КАПШАЙ, Т. СІМАНАВА,**
**асістэнты кафедры рускай літаратуры**

## Сход камсамольска-прафсаюзнага актыву

У мінулую пятніцу ў актавай зале універсітэта адбыўся сход камсамольска-прафсаюзнага актыву ГДУ. Па дакладу сакратара камітэта ЛКСМБ універсітэта М. Жукевіча абмеркаваны вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі 1987-88 навучальнага года, задачы камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый па паляпшэнню вучэбна-выхаваўчай работы ў святле рашэнняў лютаўскага (1988 г.) Пленума ЦК КПСС.

З дакладам аб ходзе выканання пастановы ЦК КПСС аб барацьбе з п'янствам і алкагалізмам выступіла старшыня прафкома студэнтаў Н. Колтышава.

У спрэчках па абмяркоўваемых пытаннях прынялі удзел: студэнтка біялагічнага факультэта С. Воднікава; старшыня ВВК фізічнага факультэта І. Ліба; член камітэта ЛКСМБ гістфіла другакурснік І. Ксянзоў, студэнтка матэматычнага факультэта З. Школьнік, старшыня студсавета інтэрната № 4, студэнт эканамічнага факультэта Л. Зайцаў; студэнт эканомфака В. Дзмітрыеўцаў; сакратар камсамольскага бюро выкладчыкаў і супрацоўнікаў Л. Маляўка; сакратар камсамольскага бюро біяфака А. Саварын; студэнт біяфака П. Макарэвіч; студэнты гістфіла і матфака Я. Шацілава і Ю. Краўчанка; прарэктар ГДУ па завочнаму навучанню Л. Н. Сечка.

Сход камсамольска-прафсаюзнага актыву прыняў адпаведную пастанову.

У рабоце сходу прынялі ўдзел сакратар парткома ГДУ М. І. Старавойтаў, загадчык студэнцкага аддзела абкома камсамола М. А. Харанека, якія выступілі, і інструктар Цэнтральнага РК КПБ М. А. Беразоўская.

* * *

Справаздача са сходу камсамольска-прафсаюзнага актыву універсітэта будзе змешчана ў наступным нумары нашай газеты.



НА ЗДЫМКУ: чацвёртакурсніца біялагічнага факультэта Т. Швядоўская даследуе анатамічную будову сцяблоў дамінанта лугавога фітацэнозу пад уплывам мінеральных угнаенняў.

Фота А. Ульянкінай.

## Адбудзецца дыскусійная размова

Заўтра ў Доме палітычнай асветы (вуліца Ланге, 17) у 18 гадзін 30 мінут пачнецца дыскусійная сустрэча «Моладзь і экалогія». Камсамольцы і моладзь г. Гомеля запрашаюцца да размовы па наступных пытаннях: «Экалогія. Што гэта такое?», «Ці магчыма існаванне сучаснага грамадства без высокай экалагічнай культуры?», «Ці будзе дасягнута гармонія грамадства і прыроды ў будучыні?».

На дыскусію запрошаны ад нашага універсітэта прафесар, доктар біялагічных навук, загадчык кафедры заалогіі і аховы прыроды Б. П. Савіцкі, доктар біялагічных навук, загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін Л. М. Сапегін.

У праграме сустрэчы — прагляд дакументальных фільмаў «Трава ля дома», «Месца сустрэчы змяніць нельга».

## З узнагародай!

За шматгадовую плённую працу па падрыхтоўцы спецыялістаў фізічнага выхавання, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння старшыя выкладчыкі кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту КІРЭЕЎ Валерый Канстанцінавіч і ПРАЦКО Юрый Піліпавіч узнагароджаны Ганаровымі граматамі рэктарата, парткома і прафкома універсітэта.

* * *

За шматгадовую плённую працу па падрыхтоўцы і камуністычнаму выхаванню маладых спецыялістаў, актыўную грамадскую і навуковую дзейнасць і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта ГУЛІЦКІ Мікалай Фёдаравіч узнагароджаны Ганаровай граматай рэктарата, парткома і прафкома універсітэта.

# ДА 850-ГОДДЗЯ ЗАСНАВАННЯ ГОМЕЛЯ ЗРОБІМ ЯГО ЎЗОРНЫМ ГОРАДАМ!

**Гэты Зварот ганаровых грамадзян і групы ветэранаў горада да ўсіх жыхароў Гомеля быў надрукаваны ў газеце «Гомельская праўда» за 1 сакавіка г. г. Ён выклікан велізарнай адказнасцю за ажыццяўленне намечанай партыяй перабудовы ва ўсіх сферах нашага жыцця, заклапочанасцю аб тым, ці ўсё робіць кожны з нас так, як гэтага патрабуе рэвалюцыйны час перабудовы.**

**Ганаровыя грамадзяне і ветэраны звяртаюцца да ўсіх жыхароў нашага горада з заклікам зрабіць наш родны Гомель горадам высокай культуры і ўзорнага грамадскага парадку, узяць сабе спадарожнікамі ў сённяшні і заўтрашні дзень працавітасць, розум, душэўную чысціню. Гомельскі гарком КПБ падтрымаў Зварот, рэкамендаваў апублікаваць яго ва ўсіх шматтыражных газетах горада, разгарнуць у калектывах шырокую работу па падтрымцы Звароту, па ажыццяўленню ўсяго, да чаго заклікаюць лепшыя людзі горада.**

# ЗВАРОТ

## ГАНАРОВЫХ ГРАМАДЗЯН І ГРУПЫ ВЕТЭРАНАЎ ГОРАДА ДА ЎСІХ ЖЫХАРОЎ ГОМЕЛЯ

Дарагія таварышы!

Урачыста і шырока ўсе мы адзначылі 70-годдзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Высокім грамадзянскім сэнсам былі напоўнены юбілейныя мерапрыемствы, якія праводзіліся ў нашым горадзе. Гамяльчане сталі не толькі сведкамі, але і актыўнымі ўдзельнікамі многіх цікавых ініцыятыў, свят. Усё гэта абавязвае нас не толькі па-іншаму асэнсаваць пройдзены шлях. Узнікае велізарная адказнасць за ажыццяўленне намечанай партыяй перабудовы ва ўсіх сферах нашага жыцця. Час патрабуе ператварыць родны Гомель у горад высокай прадукцыйнасці працы, культуры, узорнага грамадскага парадку.

Мы лічым, што гамяльчане павінны многае зрабіць для далейшага росквіту свайго горада. Гісторыя ардэнаноснага Гомеля багатая слаўнымі рэвалюцыйнымі, баявымі і працоўнымі традыцыямі. У яго летапіс упісана нямала прозвішчаў патрыётаў — герояў бальшавіцкага падполля, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, герояў першых пяцігодак, пасляваеннага аднаўлення. Гэта абавязвае ўсіх нас як бы па-новаму зірнуць на нашу прыналежнасць да горада, яго лёсу. І чым больш узіраешся ў гісторыю, тым больш пранікаешся павагай да яго сыноў і дачок, да яго жыхароў.

Памяць вяртае нас у суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны і аднаўленчага перыяду. З дапамогай брацкіх народаў нашай краіны мы адбудавалі наш Гомель. Ён стаў яшчэ прыгажэйшым, чым быў да вайны. У цяперашні час гэта індустрыяльны, навуковы, культурны цэнтр вобласці, адзін з прыгажэйшых гарадоў рэспублікі, насельніцтва якога набліжаецца да 500 тысяч. Багатая гісторыя нашага горада. У 1992 годзе яму споўніцца 850 гадоў. У ім усё належыць нам, гамяльчанам. І ўчарашні, і сённяшні, і заўтрашні дзень.

Але ці ўсё робім так, як гэтага патрабуе рэвалюцыйны час перабудовы? Гэта пытанне кожны з нас павінен задаць сам сабе. Высокая грамадзянская пазіцыя, нецярпімасць да недахопаў — гэта, на наш погляд, неад'емная рыса, якая павінна стаць характэрнай для кожнага гамяльчаніна. Час абавязвае нас зрабіць для свайго горада значна больш.

Мы павінны быць неабыякавыя да якасці той прадукцыі, якую выпускаюць нашы заводы, фабрыкі, аб'яднанні. Мы павінны быць неабыякавыя да ідэйнага і духоўнага свету нашай моладзі, дзяцей, да іх выхавання ў духу высокіх маральных ідэалаў, культуры зносін. Мы павінны быць неабыякавыя да архітэктуры нашых раёнаў, парадку на вуліцах, у дамах і ў дварах, у кожнай сям'і.

Нам усім — рабочым, інжынерна-тэхнічным работнікам, інтэлігенцыі, вучоным, партыйным і савецкім, камсамольскім работнікам, ветэранам вайны, працы, Узброеных Сіл неабходна быць актыўнымі байцамі перабудовы, укаранення ўсяго новага, перадавога. Перабудова азначае аднаўленне і развіццё нашых непраходзячых каштоўнасцей — усё для чалавека і ў імя чалавека. Партыя разлічвае на веды, розум, вопыт кожнага, на лепшыя чалавечыя якасці, адкрывае максімальныя магчымасці для выхавання людзей жыццём, удзелам у агульнай рабоце, у зацвярджэнні навізны ў эканоміцы, дэмакратыі, галоснасці.

У сваім паўсядзённым жыцці мы павінны праяўляць высокую грамадзянскую актыўнасць, мацаваць дысцыпліну, парадак. Хіба можна мірыцца з тым, што грубасць, хамства, бестактоўнасць, ашуканства даволі часта сустракаюцца ў гандлі і бытавым абслугоўванні, на транспарце, у медыцыне? Гнеў і абурэнне ва ўсіх сумленных людзей выклікаюць такія ганебныя з'явы, як п'янства, крадзяжы сацыялістычнай уласнасці, спекуляцыя, хабарніцтва, брыдкаслоўе, непаважлівыя адносіны да пажылых людзей, жанчыны.

У горадзе зроблены першыя крокі па пераадоленню п'янства. Але жорсткі вораг не знішчаны. Ён пачаў прыбірацца ў іншае адзенне: наркаманію, таксікаманію, самагонаварэнне. На вялікі наш жаль, на вуліцах Гомеля сустракаюцца п'яныя маладыя людзі, якім прадаваць спіртное забаронена. А мы — дарослыя не разбіраемся, не пытаем, хто штурхае моладзь на гэты страшны шлях. У кватэры некаторых грамадзян «пасялілася» самагонаварэнне. І мы з гэтай, чужой нашаму грамадству з'явай, не вядзём належную барацьбу. Не аддаём усеагульнай ганьбе і асуджэнню тых, хто не даражыць гонарам і годнасцю савецкага чалавека.

У нас выклікаюць заклапочанасць, абурэнне, душэўны неспакой паводзіны ў грамадскіх месцах, на вуліцах, у парках і скверах той часткі моладзі, якая слепа капіруе буржуазную масавую культуру, не занята карыснай справай. У гэтым мы бачым вялікую віну бацькоў, а таксама грамадскіх арганізацый, якія аслабілі свой уплыў на розумы, паводзіны маладых людзей. Мы павінны пастаянна клапаціцца аб нашых дзецях, моладзі, быць уважлівымі да іх запатрабаванняў, фарміраваць у іх камуністычны светапогляд.

У Гомелі пражываюць ветэраны вайны, працы, Узброеных Сіл. Звяртаемся да вас, паважаныя таварышы! Вы можаце аказаць неацэнную дапамогу ў арганізацыі выхавання моладзі. Нам трэба вучыць дзяцей высокай культуры асабістых узаемаадносін, захоўванню чысціні, парадку ў дварах, пад'ездах. А моладзь, у сваю чаргу, павінна памятаць, што месцы ў тралейбусе, аўтобусе — для пажылых людзей, жанчын. Сваё слова аб выхаванні юнакоў і дзяўчат павінны сказаць саветы ветэранаў, жансаветы, якія створаны ў працоўных калектывах горада. Ваш багаты жыццёвы вопыт павінен стаць здабыткам моладзі.

Выхаванне пачуцця гаспадара горада пачынаецца з адносін да народнага дабра. Эканомія электраэнергіі, вады, цяпла, прыроднага газу, металу, цэменту, жылога фонду павінна стаць кроўнай справай кожнай сям'і, кожнага працоўнага калектыву.

Для таго, каб наш Гомель стаў яшчэ прыгажэйшым, яшчэ лепшым, кожнаму жыхару, калектыву прадстаіць канкрэтнай справай, сваім асабістым удзелам у працы ўнесці свой уклад у вырашэнне ўсіх нашых праблем. Неабходна гаспадарчым спосабам шырэй разгарнуць жыллёвае будаўніцтва. Трэба арганізаваць шэфства прадпрыемстваў над рэканструкцыяй, будаўніцтвам устаноў культуры, спорту, аховы здароўя, асветы.

Мы заклікаем гамяльчан: выйдзем вясной сёлетняга года ў двары сваіх жылых дамоў, у пад'езды. Створым рамонтныя брыгады па добраўпарадкаванню, азеляненню, будаўніцтву прасцейшых спартыўных збудаванняў для заняткаў фізкультурай па месцу жыхарства.

Звяртаемся да студэнцкай моладзі: стварайце будаўнічыя атрады па рамонту дамоў, кватэр, у якіх пражываюць адзінокія ветэраны вайны, працы.

Мы звяртаемся да народных умельцаў, дызайнераў, мастакоў, праектантаў: зробім наш горад яшчэ больш прыгожым, няхай кожны двор, кожны балкон, лоджыя набудуць прыгожы выгляд, няхай абноўленым бляскам зазззяюць помнікі старадаўнасці, дарагія сэрцу кожнага гамяльчаніна. Не збяднеў жа наш горад на таленты!

Давайце шляхам уласнай ініцыятывы зробім так, каб падвал кожнага дома стаў своеасаблівай дамашняй майстэрняй, эстэтычна, прыгожа абсталяванай, каб можна было тут працаваць з дзецьмі.

Кожнаму мікрараёну — сваю зялёную зону адпачынку! Сумесна з прадпрыемствамі абсталюем іх пляцоўкамі для цікавага правядзення адпачынку нашых сем'яў, моладзі. Будзем прымаць самы актыўны ўдзел у суботніках, нядзельніках па добраўпарадкаванню, азеляненню. Захаваем усё, што пасаджана рукамі людзей.

У мікрараёнах нашага горада неабходна штогод праводзіць шанаванне сямейных дынастый, святы вуліц, выстаўкі вырабаў народных умельцаў. Новыя абрады павінны смела ўваходзіць у наша жыццё. Яны павінны стаць традыцыйнымі, безалкагольнымі.

Ад імя ветэранаў мы звяртаемся да ўсіх гамяльчан: у гонар 45-годдзя вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якое мы адзначаем у гэтым годзе, разгарнуць шырокую ваенна-патрыятычную работу. Мы заклікаем падтрымаць нашу даўнюю традыцыю — азнаменаваць дзень вызвалення роднага Гомеля ўнясеннем у Савецкі фонд міру 1 мільёна 200 тысяч рублёў.

Прапануем вясной гэтага года правесці агульнагарадское свята «Мір дому твайму», да якога добра падрыхтаваць і жылы дом, і інтэрнат, і свой двор, і дом суседа-ветэрана, у каго нікога не засталося з блізкіх, родных. Няхай у нашых дамах паселяцца калектывізм і ўзаемадапамога, добрыя адносіны з суседзямі, непрымірымасць да таго, што перашкаджае жыць, працаваць, адпачываць.

Пройдзе нямнога часу, і мы будзем адзначаць 850-годдзе заснавання горада над Сожам. Да гэтага свята мы павінны добра падрыхтавацца. Патрэбна, каб да юбілейных урачыстасцей Гомель апрануўся ў святочнае ўбранства. Неабходна добраўпарадкаваць вуліцы і плошчы, закласці новыя алеі і скверы. На канцэртных пляцоўках неабходна арганізаваць выступленні лепшых творчых калектываў, майстроў мастацтваў.

Прапануем устанавіць юбілейны фонд горада. У яго могуць адлічвацца сумы ў выглядзе долевага ўдзелу прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, зборы ад канцэртаў, сродкі, зароблены на суботніках, асабістыя ўклады жыхароў горада. Усе сабраныя сродкі будуць выкарыстаны для падрыхтоўкі і правядзення святочных мерапрыемстваў, далейшага развіцця і добраўпарадкавання горада.

Мы звяртаемся праз газету «Гомельская праўда» да ўсіх гамяльчан: давайце на старонках газеты павядзём размову аб тым, як зрабіць наш родны Гомель горадам высокай культуры і ўзорнага грамадскага парадку.

Працавітасць, розум, душэўная чысціня — вось нашы спадарожнікі ў сённяшні і заўтрашні дзень.

**П. ДЗЕМЧАНКА**, брыгадзір слесараў-зборшчыкаў аб'яднання «Вымяральнік», ганаровы грамадзянін г. Гомеля; **Р. ДЗЕНІСЕНКА**, начальнік аддзела завода «Электраапаратура», Герой Савецкага Саюза, старшыня абласнога савета ветэранаў вайны і працы; **П. КАВАЛЁЎ**, брыгадзір слесараў вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш», Герой Сацыялістычнай Працы, член бюро абкома КПБ; **А. РЫБАЛЬЧАНКА**, метадыст гарадскога Дома культуры, народны артыст БССР; **Р. МУХІН**, генерал-маёр у адстаўцы, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў; **А. АВЕРЧАНКА**, галоўны ўрач 3-й гарадской бальніцы, выдатнік аховы здароўя СССР; **А. МІЛЕЎСКІ**, ганаровы грамадзянін г. Гомеля; **М. ЛЕБЕДЗЕЎ**, заслужаны настаўнік БССР, поўны кавалер ордэна Славы, старшыня гарадскога савета ветэранаў вайны і працы; **У. ГУБАНАЎ**, брыгадзір аўтаматчыкаў вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш», дэпутат Вярхоўнага Савета СССР; **А. СВІРЫДЗЁНАК**, дырэктар Інстытута механікі металапалімерных сістэм АН БССР, акадэмік АН БССР; **М. ЗВАГЕЛЬСКІ**, дырэктар спартыўнай школы № 4, заслужаны трэнер БССР; **С. САМУХА**, брыгадзір комплекснай брыгады СУ-139 вытворчага аб'яднання «Гомельпрамбуд», заслужаны будаўнік БССР.

# БОЛЬШ КАНКРЭТНАЙ ДАПАМОГІ

Прайшоў Усесаюзны рэйд з мэтай паляпшэння матэрыяльна-бытавых умоў жыцця пенсіянераў — ветэранаў вайны і працы. Паўсюдна абмеркаваны яго вынікі. У цэнтральнай і мясцовай прэсе апублікаваны не толькі матэрыялы рэйда, але і паведамленні аб тых пазітыўных зрухах, якія адбыліся ў справе павышэння клопатаў з боку адміністрацыйных органаў і грамадскіх арганізацый краіны, у першую чаргу маладзёжных, аб патрэбах ветэранаў.

Адначасова адзначалася, што станоўчыя змены адбыліся не ўсюды. Малаадчувальныя яны і ў калектыве нашага універсітэта, хаця саветам ветэранаў вайны і працы пры падтрымцы парткома былі зроблены ў гэтым напрамку пэўныя захады. У прыватнасці, вынікі рэйда абмяркоўваліся на пашыраным пасяджэнні рэктарата ГДУ і аб прынятым на ім рашэнні паведамлялася на старонках шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт» у артыкуле «Побач з намі — ветэраны...» (22 снежня 1987 г.). У гэтай публікацыі канкрэтна ўказваліся патрэбы ветэранаў, сфармулявана просьба іх савета да маладзёжных арганізацый універсітэта аб устанаўленні шэфства, у першую чаргу, над адзінокімі і састарэлымі людзьмі, аб аказанні ім дапамогі ў дастаўцы прадуктаў з магазіна, ва ўборцы і дробным рамонце кватэр і надворных пабудоў. У гэтым жа артыкуле савет ветэранаў звяртаўся да студэнцкай моладзі з просьбай актыўна ўключыцца ў размову аб маральным абліччы студэнта, якая была пачата ў газеце «Гомельскі універсітэт» артыкулам ветэрана вайны і працы дацэнта В. Р. Сіманава («Выхаваць у сабе грамадзяніна», 13 кастрычніка 1987 г.).

На жаль, ні на адну з гэтых просьб ні камітэт камсамола, ні студэнцкі прафком, ні адна акадэмічная група не адгукнуліся. Між тым ва ўсіх гэтых падраздзяленнях ідзе падтрымка перабудовы. Мы чуем ідэалагічна вытрыманыя ў духу рашэнняў КПСС прамовы на розных пасяджэннях і сходах ва універсітэце. Публічна крытыкуюцца памылкі, допушчаныя кіраўніцтвам краіны на пэўных этапах сацыялістычнага будаўніцтва, у сістэме агульнаадукацыйнай і вышэйшай школы, у камуністычным выхаванні мас. Але што ж асабіста робім, каб выправіць становішча? Вельмі мала.

Да гэтага часу адміністрацыя не адрэагавала на просьбу савета ветэранаў аб працаўладкаванні яшчэ працаздольных пенсіянераў С. А. Паплаўскага, В. І. Мядзведзевай і іншых, хто яшчэ змог бы прынесці значную карысць для калектыву універсітэта. У даным выпадку рэдакцыя шматтыражкі не праявіла патрэбнай настойлівасці, каб на яе выступленне былі атрыманы канкрэтныя адказы ад рэктарата, дэканатаў, кафедр, вучэбнай часткі і г. д. Ёсць недапрацоўкі і з нашага боку.

Напэўна, ужо многія азнаёміліся са «Зваротам ганаровых грамадзян і групы ветэранаў горада да ўсіх жыхароў г. Гомеля», апублікаваным на старонках «Гомельскай праўды» за 1 сакавіка 1988 г. Пастаўленыя ў ім пытанні і праблемы вельмі актуальныя і надзённыя. Калектыў ГДУ і асабліва студэнцкая моладзь павінны ўнесці ў гэтую агульную справу дастойны ўклад.

**САВЕТ ВЕТЭРАНАЎ ВАЙНЫ І ПРАЦЫ ГДУ.**



У адным з нумароў нашай газеты паведамлялася аб сустрэчы кандыдатаў у алімпійскую зборную каманду СССР для ўдзелу ў летніх гульнях студэнтаў ГДУ з членамі Вучонага савета універсітэта. У той дзень быў зроблены і гэты здымак.

Злева направа: майстры спорту СССР міжнароднага класа У. Мажэйка, А. Мызгін, заслужаны майстар спорту СССР В. Пусеў, рэктар універсітэта акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць, майстар спорту СССР міжнароднага класа Д. Банькоўскі, сакратар парткома М. І. Старавойтаў.

Фота А. Ульянкінай.

# З ЛЮБОЎЮ ДА РОДНАГА СЛОВА

**Цябе забаранялі, быццам свята,**
**Нібы злачынцу зацiскалі рот.**
**А ты і з-за выкрэсленняў,**
**нібы з-за кратаў,**
**Глядзела на знямелы свой**
**народ.**

Такімі словамі пра родную мову пачалася літаратурна-музычная кампазіцыя «З любоўю да роднага слова», якую падрыхтавалі члены дыялекталагічнага гуртка і гуртка методыкі выкладання літаратуры гісторыка-філалагічнага факультэта. У актавай зале універсітэта сабраліся выкладчыкі, студэнты і вучні сярэдніх школ №№ 17 і 26, усе, хто любіць і шануе родную мову.

У наш час, час пераасэнсавання духоўных каштоўнасцей грамадства, зварот да гісторыі нацыянальнай культуры — сведчанне актыўнай грамадскай пазіцыі. Менавіта гэта і пацвердзілі студэнты, будучыя настаўнікі беларускай мовы і літаратуры, якія клапоцяцца аб далейшым лёсе роднай мовы.

Родная мова... Матчына мова... Гэтак шаноўна і ласкава называе беларускі народ свой неацэнны здабытак. Студэнты яшчэ раз нагадалі нам аб тым, які складаны шлях прайшла ў сваім развіцці беларуская мова, успомнілі цёплымі словамі В. Дуніна-Марцінкевіча і Ф. Багушэвіча, А. Цётку і М. Багдановіча, Я. Купалу і Я. Коласа.

На сцэне ажылі героі «Пінскай шляхты» В. Дуніна-Марцінкевіча, актуальна і пранікнёна прагучалі радкі з «Прадмоў» Ф. Багушэвіча, адрасаваныя беларускаму народу. Багацце роднай мовы, яе мілагучнасць і прыгажосць данеслі да нас выканаўцы народных песень і песень на вершы беларускіх савецкіх паэтаў.

Як жывыя, паўсталі перад намі мележаўскія героі. Студэнты здолелі перадаць, чым жылі персанажы «Людзей на балоце», што хвалявала іх, да чаго яны імкнуліся.

Адзначалася, што няма ніводнага сучаснага беларускага пісьменніка, які не выказаў бы сваёй замілаванасці да роднай мовы, не склаў бы ўзнёслых, прачулых радкоў, напоўненых патрыятычнымі пачуццямі і думкамі пра свой край і народ.

Вершы П. Броўкі, М. Танка, Н. Гілевіча, П. Панчанкі і інш., прачытаныя ўдзельнікамі літаратурна-музычнай кампазіцыі, прымусілі кожнага з нас задумацца над шляхамі далейшага развіцця роднага слова, роднай літаратуры.

Развітваючыся са слухачамі, кіраўнікі вечара выказалі пажаданне, каб такія сустрэчы сталі традыцыйнымі, каб будучыя настаўнікі далучалі сваіх выхаванцаў да вытокаў і першаасновы нашай культуры, да скарбаў народнай мудрасці, абуджалі жаданне глыбей зазірнуць у таямніцу мовы.

Хочацца выказаць словы шчырай удзячнасці арганізатарам гэтай сустрэчы дацэнтам кафедр беларускай мовы і літаратуры В. А. Гуліцкай і В. І. Смыкоўскай, а таксама студэнтам, якія прымалі ў ёй актыўны ўдзел, і пажадаць ім творчых поспехаў у працы і вучобе.

**В. ЯЦУХНА, Л. КРЫШЧЫК,**
**ст. лабаранты кафедры беларускай мовы.**

*Аб праблемах, якія нас хвалююць*

**Выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты ГДУ запрашаюцца на размову аб праблемах р. Прыпяці. Яна пачнецца ў 11 гадзін 18-га сакавіка ў актавай зале.**

**Абмеркаванне важнай тэмы арганізуецца выкладчыкамі біялагічнага факультэта і універсітэцкай Дружынай па ахове прыроды.**

**У ходзе дыскусіі вы можаце падзяліцца ўласнымі думкамі, выказаць асабістае меркаванне, глыбей пазнаёміцца з тымі экалагічнымі праблемамі, якія існуюць на сённяшні дзень.**

**Ніжэй публікуемы матэрыял прымеркаваны да прадстаячай размовы.**

# ШТО МЫ ЎБАЧЫМ ЗАЎТРА?

У наш век тэхнічнага прагрэсу немагчыма абысціся без меліярацыі зямель. Гэты факт быў пацверджаны яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя заходняй экспедыцыяй па асушэнню балот Палесся, якую ўзначальваў І. І. Жылінскі.

Слова «меліярацыя» пры перакладзе з лацінскай мовы абазначае «паляпшэнне». Але на практыцы выконваюцца не ўсе мерапрыемствы комплексу меліярацыі, галоўным чынам, вядзецца толькі асушэнне балот.

Пагоня за танным коштам меліярацыі аднаго гектара прывяла да знікнення малых рэчак, што ў сваю чаргу шкодна адбілася на поймавых сенажацях, знішчэння рыбных запасаў, зніжэння ўзроўню грунтовых вод на сумежных сельскагаспадарчых палетках, у калодзежах. У выніку глеба аказалася пераасушанай, ад чаго здараюцца чорныя тарфяныя шугавеі, іншыя адмоўныя з'явы. Натуральна, знізілася прадуктыўнасць зямельных угоддзяў, што не магло не адбіцца на ўраджаях збожжавых на асушаных тарфяніках.

Здавалася б, неабходна тэрмінова зрабіць вывады. Але іх не зрабілі. І сёння зноў, як 100 гадоў назад, праблема Палесся паўстае з новай сілай. Інтэнсіўнае асушэнне вялікага рэгіёну вялося практычна без уліку аховы прыроды, што паставіла ўнікальны ландшафтна-экалагічны комплекс пад пагрозу знікнення. Катастрафічна скараціўся і скарачаецца відавы склад жывёлін, раслін і птушак. Як прыклад, на Палессі ўжо знікла больш 70 відаў раслін, апрача гэтага, пад пагрозай знікнення знаходзіцца яшчэ каля ста. Не вырашае праблемы і існуючая сетка запаведных тэрыторый, якая складае ўсяго 1,1% ад агульнага абшару рэгіёна, што значна менш гранічна неабходнай.

Але нават пры такой тэхнічнай экспансіі на Палессі да сённяшніх дзён засталіся яшчэ некранутымі цяжкадаступныя забалочаныя поймы буйных рэк, у тым ліку і асноўнай воднай артэрыі Палесся — Прыпяці. Але толькі да сённяшніх дзён!

Цяпер Мінводгасам БССР запланавана асушэнне і асваенне поймы Прыпяці і нізоўяў яе прытокаў. Здзейсніць гэта плануецца шляхам стварэння польдэрных сістэм, для чаго рэчышча Прыпяці будзе абвалавана. Апрача таго, плануецца абвалаванне і нізоўяў яе прытокаў. Адгароджаныя такім чынам ад рэк, землі будуць асушаны пры дапамозе помпавых станцый, плануецца таксама выпростванне значных плошчаў рэчышча Прыпяці.

Афіцыйны праект ставіць мэтай стварэнне на Прыпяці супрацьпаводкавай сістэмы аховы, але, зыходзячы з фонду запланаваных капітальных укладанняў, бачна галоўная мэта праекта — асваенне і асушэнне новых поймавых зямель. На асушэнне выдаткоўваецца ў 4,3 разы больш сродкаў, чым на ўсе іншыя работы.

Ёсць сэнс параўнаць страты ад паводкі і выдаткі на абвалаванне, колькі спатрэбіцца штогод сродкаў для перапампоўкі вады з польдэраў і назад. Акрамя таго, пры будаўніцтве польдэраў з гаспадарчага звароту знікае звыш 130 тыс. га зямель, якія ў цяперашні час можна выкарыстоўваць як сенажаці. Што ж даецца ўзамен?

А хто ацэніць тыя маральныя страты, якія панясе грамадства, калі знікнуць непаўторныя па сваёй прыгажосці краявіды, апошнія запаведныя месцы Палесся? Так, у тэхніча-эканамічных абгрунтаваннях інжынерных мерапрыемстваў па ахове ад затаплення і меліярацыі поймы ракі Прыпяць запісана, што ва ўмовах асваення Прыпяці захаванне існуючага гідралагічнага рэжыму Прыпяцкага запаведніка немагчыма. Распрацаваны нават варыянт затаплення запаведніка сцёкамі яго ж уласнага вадазабору. Гэта нішто іншае, як мэтанакіраванае знішчэнне запаведніка.

Нагадаем, што Прыпяцкі ландшафтна-гідралагічны запаведнік заснаваны з мэтай зберагчы ўнікальныя ландшафты Беларускага Палесся і вывучаць змены ў прыродзе у сувязі з меліярацыяй зямель. Сапраўды, на розум меліяратара непатрэбнасць запаведніка відавочная, бо аб якім «вывучэнні змен у прыродзе ў сувязі з меліярацыяй» можа ісці гаворка, калі няма той прыроды, калі асушаюцца апошнія абшары балот.

Аб унікальнасці Прыпяцкага запаведніка сведчыць тое, што на яго тэрыторыі захаваліся ўнікальныя поймавыя дубровы (сярэдні ўзрост дрэў перавышае 200 гадоў) і зараснікі вярбы (узрост асобных дрэў больш за 100 гадоў). Прыпяцкі запаведнік — гэта апошні прытулак для 23 відаў раслін, 47 — жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу БССР. Гэта і вялікая колькасць відаў вышэйшых раслін, млекакормячых, птушак, земнаводных, паўзуноў і рыб, тыповых для ўсяго Палесся.

Апрача гэтага, на Палессі выяўлены археалагічныя помнікі ўсіх гістарычных эпох пасляледніковага перыяду. Так, каля 250 з іх знаходзяцца на адлегласці да трох кіламетраў ад сучаснага рэчышча Прыпяці і нізоўяў яе прытокаў, г. зн. тая тэрыторыя, што апынецца ў міждамбавай прасторы.

Даўно наспеў час зразумець, што для такіх велізарных прыродапераўтваральных праектаў метад спроб і памылак непрымальны. Пры сучасным размаху меліярацыйных работ і тэхнічным узбраенні любая, няхай нават самая дробязная памылка можа быць катастрафічна незваротнай. Уплыў чалавека на навакольнае асяроддзе сёння такі, што ён не можа прайсці бясследна. Што ж мы ўбачым заўтра?.. Гэта пытанне асабліва хвалюе нас, моладзь, бо жыць на гэтай зямлі нам. І заўтра нам давядзецца расплачвацца за памылковыя праекты нашых бацькоў, і ніхто не здолее адказаць, ці здужаем мы гэта. А сёння ўсё залежыць ад нашай дзейнасці.

**Р. ХАЛАДЗІЛІНА,**
**студэнтка 5-га курса біяфака, член штаба Дружыны па ахове прыроды.**

# ПУЦЁЎКІ ДЛЯ ПАДАРОЖЖА ЗА МЯЖУ

Абком прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў выдзеліў нашаму універсітэту турыстычныя пуцёўкі для камплектавання тургруп на 1988 год.

**Румынія — Югаславія** — на чэрвень, тэрмінам 15 дзён (арыентыровачны кошт пуцёўкі — 650 руб.). Дакументы прадставіць у прафком універсітэта на гэтым тыдні.

**ЧССР** — у жніўні, тэрмінам 13 дзён, **Балгарыя** — у ліпені, тэрмінам 18 дзён, **Румынія** — у ліпені, тэрмінам 14 дзён, **ГДР** (з адпачынкам) — у ліпені.

На ўсе маршруты — па адной пуцёўцы. Арыентыровачны кошт пуцёвак у ЧССР і НРБ — 450 руб., у СРР і ГДР — 380 руб. Прадстаўленне дакументаў — да 15 красавіка г. г.

Для студэнтаў выдзелена 12 пуцёвак на ліпень тэрмінам 14 дзён для паездкі ў Румынію. Арыентыровачны кошт пуцёўкі — 380 рублёў. Дакументы прадставіць да 15 красавіка.

# Адбудзецца сустрэча

«Усе жанры добрыя, акрамя сумнага» — такую назву носіць сустрэча з лаўрэатам прэміі «Залатое цяля» «Литературной газеты» пісьменнікам-гумарыстам Міхаілам Геніным, якая адбудзецца 18 сакавіка ў актавай зале ГДУ.

Білеты можна набыць у прафкоме студэнтаў. Пачатак сустрэчы — у 16 гадзін.

## СПОРТ

# УСЁ ПАЧНЕЦЦА З НУЛЯ

У Слуцку адбыліся гульні трэцяга тура папярэдняга этапа чэмпіянату Беларусі па ручному мячу сярод жаночых каманд. Ужо на працягу многіх гадоў гонар Гомельшчыны абараняюць студэнткі ГДУ (трэнер В. Крукоўскі). Паспяхова яны выступілі і на гэты раз. Асабліва ўнушальнай перамогі — 46:7 — нашы гандбалісткі дабіліся над віцябчанкамі. Вялікую перавагу яны мелі і ў сустрэчы з камандай Брэста — 44:26. Сур'ёзнага супраціўлення не здолелі аказаць нашым дзяўчатам магіляўчанкі і спартсменкі г. Гродна.

Па-сапраўднаму востры характар насіла гульня з гандбалісткамі Мінска. Гамяльчанкі мелі рэальную магчымасць атрымаць перамогу і ў гэтай сустрэчы. Аднак пад канец матча яны ўпусцілі сваю перавагу і ў выніку суддзя зафіксаваў нічыю — 29:29.

На завяршаючы этап спаборніцтваў, дзе пойдзе барацьба за ўзнагароды, выйшлі чатыры мацнейшыя каманды — Мінска, Гомеля, Брэста і Гродна. Зазначым, што ачкі, набраныя ў папярэдніх турах, у залік не ідуць. Як кажуць, усё пачнецца з нуля.

У фінале, які адбудзецца з 21 па 27 красавіка ў Гомелі, гульні пройдуць у два туры. Пасля гэтага выявяцца чэмпіён і прызёры першынства. Гамяльчанкі поўныя рашучасці прадэманстраваць усё сваё майстэрства, каб узняцца на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару і тым самым яшчэ раз пацвердзіць, што яны з'яўляюцца аднымі з мацнейшых у гэтым захапляючым відзе спорту

# СЕЗОН АДКРЫЛІ ЛЁГКААТЛЕТЫ

У Гомельскім спартыўным комплексе «Дынама» праведзена рэспубліканскае зімовае першынство спартклубаў ВНУ па лёгкай атлетыцы. У асобных відах паспяхова выступілі спартсмены нашага універсітэта. Другакурсніца факультэта фізвыхавання Алена Стахава заваявала вышэйшую ўзнагароду ў скачках у даўжыню. Яе вынік — 5 м 97 см.

Дзве ўзнагароды на рахунку другакурсніка гэтага ж факультэта Андрэя Крываротава. Ён быў мацнейшым у бегу на 3 000 м і стаў бронзавым прызёрам на дыстанцыі ўдвая меншай. Такога ж поспеху дабіўся і Ігар Бялоцкі (чацвёрты курс факультэта фізвыхавання). Ён далей за ўсіх сапернікаў прызямліўся ў сектары для скачкоў у даўжыню — на 6 м 97 см і з трэцім вынікам пераадолеў дыстанцыю 60 м.

Парадаваў і першакурснік эканамічнага факультэта Сяргей Самусёў. Пасля забегу на 200 м ён заваяваў сярэбраны жэтон, а на дыстанцыі ўдвая даўжэйшай — бронзавы.

На п'едэстал гонару ўзняўся і трэцякурснік факультэта фізвыхавання Васіль Дзікун. Ён заняў другое месца ў спаборніцтве па кіданню кап'я.

Паспяховага выступленя названых спартсменаў, на жаль, не хапіла для таго, каб заняць высокае месца ў агульным заліку. Камандай нашы лёгкаатлеты аказаліся толькі восьмымі.

**Ю. ПРАЦКО,**
**трэнер.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта, кафедра фізічнай метралогіі выказваюць глыбокае спачуванне асістэнту гэтай кафедры БАРАНАВУ Міхаілу Ціхановічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.**

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 3-11, тэл. 57-16-52.

«Гомельскі універсітэт» — орган парткома, рэктората, профсоюзных комитетов, комитета ЛКСМБ Гомельского государственного университета. Гомельская фабрика «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1.

АЗ 01117. Аб'ём — 1 друк. арк. Тыраж 2000 экз. Заказ 192.